*Святлана Кананoвіч*

# РОЛЯ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ Ў ЗАХАВАННІ І АКТУАЛІЗАЦЫІ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Мяжа XX–XXI стст. у Беларусі абазначана пераасэнсаваннем культуры як сродка самаідэнтыфікацыі нацыі. Пад культурнай спадчынай у Беларусі, згодна закону «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», варта разумець «сукупнасць адметных дасягненняў і сведчанняў гістарычнага і духоўнага жыцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях» [1, арт.1]. Асноўнай формай рэпрэзентацыі культурнай спадчыны доўга з'яўлялася штучна створанае «артэфактнае» асяроддзе. Аднак, культурная спадчына, згодна нарматыўным дакументам Рэспублікі Беларусь, гэта не толькі «адметныя матэрыяльныя аб'екты, але і нематэрыяльныя праявы творчасці чалавека, што маюць выбітныя духоўныя, эстэтычныя і дакументальныя вартасці…» [1, арт.1]. У сувязі з гэтым актуальным пытаннем развіцця айчынных музеяў стала неабходнасць пашырэння межаў музейнай прасторы і пошук новых форм працы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай. Згодна культуралагічнай парадыгме музеязнаўства, прапанаванай даследчыцай А.М.Масценіцай, музейная прастора мае зменлівую канфігурацыю і дынаміку развіцця. Пашырэнне межаў сучаснага музея абумоўлівае відазмяненне музейнай прасторы, якое ўключае ў сябе як мадэрнізацыю экспазіцыйнай, так і актыўнае развіццё пазаэкспазіцыйнай прасторы [2] .

Пошукам шляхоў абнаўлення традыцыйнага музея стала з'яўленне эксперыментальных музейных устаноў, сфера дзейнасці якіх выйшла за межы камплектавання, вывучэння, кансервацыі і экспанавання фондаў. Гэта, у сваю чаргу, выклікала ўскладненне і паглыбленне паняцця «культурная спадчына» і пашырэнне яго на тыя вобласці, у якіх яно раней не выкарыстоўвалася. Дадзеная тэндэнцыя паспрыяла распаўсюджанню новага для музеязнаўства тэрміна – музейная сфера. Яго ўзнікненне было абумоўлена цесным узаемадзеяннем музеяў з навучальнымі ўстановамі, даследчымі і інфармацыйнымі цэнтрамі, грамадскімі арганізацыямі, фондамі. Сумесныя праграмы і праекты, якія паступова наладжваліся паміж музеямі і рознага кшталту арганізацыямі, пачыналі замацоўваць міжкультурныя сувязі і пашыраць межы музейнай сферы.

Следствам такіх інтэграцыйных працэсаў стала павелічэнне ролі музеяў у адукацыі грамадства. У сувязі з гэтым, важнай тэндэнцыяй дзейнасці сучасных беларускіх музеяў стала стварэнне сацыяльных калямузейных і ўнутрымузейных аб'яднанняў. Прыкладам паспяховай працы музеяў у дадзеным кірунку могуць быць цэнтры музейнай педагогікі, цэнтры традыцыйнай культуры, клубы і дамы рамёстваў, якія ствараюцца сумесна з музеямі.

Такім чынам, музейнае ўзаемадзеянне нязменна прывяло да паступовага пераходу музеяў ад паасобных форм музейнай работы і фарміравання адзінай міжмузейнай прасторы. Задача сучасных музеяў, у тым ліку і музеяў Беларусі, аб'яднацца ў адзіную інфармацыйную прастору на шляху захавання, трансляцыі і рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Аналіз дзейнасці музеяў Беларусі сведчыць пра тое, што працэс пашырэння межаў музейнай прасторы адбываецца і ў айчынных музейных установах. Ён (працэс) патрабуе вырашэння прыкладных задач устаноў культуры — захавання і трансляцыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны краіны. У параўнанні з музеямі іншых краін свету беларускія музеі толькі пачынаюць укараняць прынцыпы, формы і метады, якія зарыентаваны на захаванне і выкарыстанне ў музейным паказе нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Супрацоўнікі музеяў імкнуцца даследаваць аб'екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны і развіваць канцэпцыі іх навуковай інтэрпрэтацыі. Нягледзячы на тое, што ў айчынным музеязнаўстве ў асноўным даследавалася матэрыяльная культура, і нематэрыяльная культурная спадчына трапляла ў беларускі музей выпадкова (нават не ўваходзіла ў яго канцэпцыю), тым не менш пераацэнка каштоўнасцяў у грамадскай свядомасці адбылася. Гэта стала вынікам таго, што музеі, якія займаюцца захаваннем элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, усё ж існуюць. Гэта Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Музей народнай культуры Мазыршчыны «Палесская веда», Веткаўскі музей народнай творчасці, Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе», Музей ручнога традыцыйнага ткацтва Паазер'я, Ашмянскі этнаграфічны музей «Млын», Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў, Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Ганцавіцкі краязнаўчы музей, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей, «Дудуткі» (недзяржаўны музейны комплекс), Ельскі краязнаўчы музей, Івацэвіцкі гісторыка-краязнаўчы музей / ф.музея — мемарыяльны комплекс «Хаваншчына», Калінкавіцкі краязнаўчы музей, Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка», Лельчыцкі раённы краязнаўчы музей, Магілёўскі музей этнаграфіі і некаторыя іншыя. Спасылаючыся на практычны вопыт адзначаных намі музеяў, стала магчымым скарэктаваць пэўны недахоп тэарэтычных даследаванняў працэсу музеефікацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны падчас напісання дадзенай работы. У айчынных музеязнаўчых крыніцах амаль адсутнічаюць звесткі пра гэта. Аднак, калі спасылацца на практычны вопыт, магчыма вылучыць пэўную дынаміку. У тых рэгіёнах Беларусі, дзе захаваліся традыцыйныя абрады, святы, рамёствы і інш., існуюць напрацоўкі музейных работнікаў, якія ў той альбо іншай ступені магчыма лічыць рэпрэзентацыяй нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Змест нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая рэпрэзентавана і захоўваецца ў музеях Беларусі, складаюць элементы, створаныя папярэднімі пакаленнямі, якія ўяўляюць выключную значнасць для культурнага генафонда нацыі і спрыяюць будучаму культурнаму прагрэсу і праяўляюцца ў наступных абласцях: вусныя традыцыі і формы выяўлення, уключаючы мову ў якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны; выканальніцкія майстэрствы; звычаі, абрады, якія адносяцца да прыроды

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сусвету; веды і ўменні, звязаныя з традыцыйнымі рамёствамі. *Сутнасць нематэрыяльнай культурнай спадчыны* ў тым, што яна з'яўляецца шматфункцыянальнай сістэмай, якая адлюстроўвае непарыўную сувязь эпох і пакаленняў, цесна звязана з яе стваральнікамі, носьбітамі і транслятарамі. Па-за межамі традыцыі і традыцыйнага светапогляду элементы НКС могуць захоўвацца ў задакументаваным выглядзе і быць рэпрэзентаваныя пры наяўнасці транслятара традыцыі альбо музейнага супрацоўніка, які пераняў гэтую традыцыю ад носьбіта. Такая форма працы з НКС змяншае яе аўтэнтычнасць, аднак дазваляе рэпрэзентаваць пры тых абставінах, калі існуюць поўныя і навукова дакладныя звесткі пра яе, але адсутнічае носьбіт традыцыі (таго ці іншага элемента НКС).

Галоўнай умовай бытавання, функцыянавання і трансляцыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў сучасным грамадстве з'яўляецца традыцыя як сістэма, здольная да самаразвіцця (саматрансляцыі), і засваенне новымі пакаленнямі элементаў культурнай спадчыны мінулага, і пераемнасць пакаленняў, якая наладжвае сувязь паміж мінулым і сучасным. З чаго вынікае, што музейная рэпрэзентацыя элементаў НКС павінна, найперш, уключаць мастацкае праектаванне, рэалізацыю (візуалізацыю) мастацкай ідэі. У працэсе рэпрэзентацыі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны павінны быць злітыя ў адно цэлае, з улікам камунікацыйнага падыходу, вобраз і сэнс. У такой мадэлі найбольш дасканала і моцна выказана вобразна-сімвальная цэласнасць элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны як творчага працэсу.

Рэпрэзентацыя элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ажыццяўляецца ў музеі з улікам якасці захаванасці і характару бытавання. Перш чым стаць музейным аб'ектам, элемент нематэрыяльнай культуры павінен прайсці некалькі этапаў музеефікацыі, таму ўключэнне яго ў інфармацыйнае поле музея адбываецца рознымі сродкамі: фіксацыя, рэвіталізацыя, мадэляванне, канструяванне. Дзе фіксацыя – перавод элемента нематэрыяльнай культуры з асяродка бытавання ў стан музейнага аб'екта без істотных зменаў.

Аналіз вопыту дзейнасці музеяў Беларусі сведчыць, што рэпрэзентацыя НКС (нематэрыяльнай культурнай спадчыны) павінна стаць адным з асноўных кірункаў дзейнасці музеяў на аснове канцэпцыі тэзаўруса НКС. Тэзаўрусны падыход дазваляе сістэматызаваць і аб'яднаць у агульны музейны збор зафіксаваныя сведчанні пра элементы НКС з усёй Беларусі. Такім чынам, змест, формы і сродкі дзейнасці музеяў Беларусі па вывучэнні, фіксацыі і кансервацыі НКС выяўляюцца ў наступных этапах музейнай работы: выўленні з асяроддзя бытавання элементаў НКС музейнага значэння; навуковым вывучэнні, апісанні і дакументаванні (як адных з асноўных папярэдніх этапаў кансервацыі зафіксаваных форм НКС сродкамі музея) аб'ектаў НКС музейнага значэння па сродках уніфікаванай інфармацыйнай сістэмы апісання элементаў НКС; актуалізацыі і рэвіталізацыі зафіксаваных элементаў НКС сродкамі музейнай рэпрэзентацыі. У якасці практычнага ўвасаблення нам падаецца мэтанакіраваным захаванне і рэпрэзентацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў музеях Беларусі па наступнай мадэлі.

*Мадэль музейнай рэпрэзентацыі НКС* Беларусі, пабудаваная на аснове даследаванага намі практычнага вопыту супрацоўнікаў беларускіх музеяў, складаецца з трох узаемадапаўняльных кампанентаў.

*Рэпрэзентацыя НКС «Жывое бытаванне»*. Дадзеная метадалагічна абгрунтаваная форма працы з НКС прадугледжвае захаванне і рэпрэзентацыю элементаў НКС праз разнастайныя інтэрактыўныя сродкі ўзаемадзеяння з наведвальнікамі з непасрэдным удзелам носьбітаў традыцыі. Пры выкарыстанні дадзенай формы рэпрэзентацыі і паслядоўнай музеефікацыі зафіксаваных форм нематэрыяльнай культурнай спадчыны аб'ектам музейнай рэпрэзентацыі можа выступаць і носьбіт традыцыі.

*Рэпрэзентацыя НКС «Музейная рэканструкцыя»*. Дадзеная форма прадугледжвае пабудову рэпрэзентацыі на аснове задакументаваных сведчанняў пра традыцыю, якія валодаюць дастаткова высокай доляй інфарматыўнасці і адпавядаюць крытэрыю навуковай дакладнасці.

*Рэпрэзентацыя НКС «Музейнае мадэляванне»*. Дадзеная форма дазваляе супрацоўнікам музея эксперыментаваць у пошуку новых увасабленняў і аб'ектаў з мэтай трансляцыі, актуалізацыі традыцыйнай культуры з выкарыстаннем элементаў як матэрыяльнай, так і нематэрыяльнай культуры. Такім чынам, *мадэль рэпрэзентацыі НКС Беларусі*, прапанаваная намі, будуецца на спалучэнні метадалагічна абгрунтаваных форм музейнай рэпрэзентацыі: «Жывое бытаванне», «Музейная рэканструкцыя», «Музейнае мадэляванне». Названую мадэль рэпрэзентацыі НКС музеямі Беларусі не- магчыма ўвасобіць без папярэдняй фіксацыі, навуковага вывучэння і дакументавання сведчанняў і дадатковых звестак пра элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, без камплектавання прадметаў і артэфактаў, якія з'яўляюцца ўвасобленымі ў фізічнай форме аспектамі нематэрыяльнай культуры і традыцыі пэўнай грамадскай супольнасці.

*Такім чынам*, вядучай тэндэнцыяй развіцця музейнай справы ў Беларусі з'яўляецца інтэграцыя музеяў і стварэнне адзінай міжмузейнай інфармацыйнай прасторы. Менавіта яна можа прапанаваць найбольш аптымальныя формы рэвіталізацыі і актуалізацыі элементаў НКС, якія могуць быць рэпрэзентаваны ў музеях Беларусі. Практычным увасабленнем такой адзінай інфармацыйнай міжмузейнай прасторы ў Беларусі з'яўляецца стварэнне сайта «Віртуальнага музея нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі». Кантэнт дадзенага сайта распрацаваны С.К. Кананові (мал. 1). Пры пэўнай падтрымцы дзяржавы, дадзены рэсурс можа стаць уніфікаванай, «жывой», рухомай і мабільнай сістэмай, да якой змогуць звяртацца і якую змогуць папаўняць музейныя супрацоўнікі з усіх музеяў Беларусі, неабыякавыя да справы захавання, аховы, рэпрэзентацыі, трансляцыі і рэвіталізацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Такім чынам, з'явіцца ўнікальная магчымасць рэвіталізаваць, у тым ліку і страчаныя ці тэрытарыяльна аддаленыя элементы нематэрыяльнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай спадчыны Беларусі, рэпрэзентаваць іх для міжнароднай супольнасці ў якасці тытульных аўтэнтычных традыцый нашага народа.

*Малюнак 1* – Лагатып электроннага рэсурса «Віртуальны музей нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі»




*Малюнак 2* – Афармленне тытульнай старонкі электроннага рэсурса

У сувязі з вышэй адзначаным магчыма даць наступныя актуальныя прапановы па ўдасканаленні агульнадзяржаўнай праграмы захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, сістэмы музейнай дзейнасці і ўніфікаванага ўліку элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны: стварыць агульнарэспубліканскую ўніфікаваную электронную сістэму апісання элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны; арганізаваць пры дзейнічаючых музеях цэнтры па актуалізацыі, трансляцыі і рэпрэзентацыі рэгіянальнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны; наладзіць сістэму перадачы звестак аб элементах, рэпрэзентаваных і зафіксаваных у рэгіянальных музеях Беларусі ў агульнанацыянальную сістэму апісання элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі; стварыць сайт «Віртуальны музей нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі».



*Малюнак 3* – Кантэнт электроннага рэсурса «Віртуальны музей нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі»

**Спіс літаратуры:**

1. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З : в ред. Закона Респ. Беларусь от 28.12.2009 г. // Консультант Плюс : Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр» Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2011.
2. Мастеница, А.М. Культурологическая парадигма музееведения / А.М. Мастеница // Музеология. Культурология [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http: //www.bvahan.com/museologypro/muzeevedenie.asp?li2=12&c_text=64. – Дата доступа : 26.11.2010.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ